Лёсы людскія

# «НІЗКІ ПАКЛОН ТАБЕ, ДОКТАР!»

**Вось ужо 75 гадоў у нашай сям'і захоўваецца невялікі, пажаўцелы лісток паперы — дакумент, дзякуючы якому маю любую мамку не вывезлі ў Нямеччыну. Яна засталася дома, выйшла замуж за нашага бацечку Рыгора Паўлавіча. Разам яны нарадзілі і вырасцілі пяцёра дзяцей, у якіх ужо свае дзеці і свае ўнукі. Цяжка ўявіць, што гэтага дружнага роду магло б, крый бог, і не быць, калі б...**



Маленькая вёсачка Рудня, што на Магілёўшчыне, размяшчалася на мяжы Крычаўскага і Клімавіцкага раёнаў. У 41-м немцы вельмі хутка захапілі нашы мясціны, хоць пад Крычавам баі былі цяжкія. У лесе да сёння шмат акопаў, людзі знаходзілі зброю.

Немцы стаялі ў суседняй вёсцы Лобжа, цэнтры сельсавета. Там жа размяшчаўся і паліцэйскі гарнізон, які ўзначальваў (хто б мог падумаць?) адзін з «адказных работнікаў» калгаса. Я знарок не называю ягонае прозвішча, каб не прычыніць боль родным, што яшчэ жывуць паміж нас.

А Рудня, нягледзячы на вайну, жыла, можна сказаць, сваім звычайным жыццём: людзі аралі зямлю, сеялі хлеб, касілі, спраўлялі вяселлі, нараджалі дзяцей, моладзь ладзіла вячоркі.

Немцы наязджалі на веласіпедах па два-тры чалавекі. Ішлі па хатах, патрабавалі яйкі, масла ды сала. Больш нахабна і жорстка паводзілі сябе паліцаі. Яны трымалі ў страху і дарослых, і дзяцей, ператрасалі ўсё ў хатах ды пунях, раскідвалі стагі і падушкі, стралялі ў столь — шукалі збеглых палонных і партызанаў. А яны ў вёсцы былі з першых дзён вайны. Часам на сценах хат з'яўляліся лістоўкі з ваеннымі звесткамі. «Масква наша! Ленінград не здаецца!» — шэптам перадавалі адзін аднаму вяскоўцы. Было зразумела, што «маланкавая вайна» правалілася.

З боку Крычава вёска была відаць як на далоні, і таму на кожны масавы рух жыхароў (касьба, выбіранне бульбы і г. д.) ляцеў снарад. Насупраць нашай хаты ад яго захавалася яміна. Яе нават не спрабавалі засыпаць. А многія снарады траплялі ў багну і не ўзрываліся.

Пасля пачатку наступлення нашых войскаў пад Сталінградам фашысты пачалі лютаваць. Паліцаі ім дапамагалі. З асаблівай жорсткасцю адбіралі скаціну, збожжа. А неўзабаве пакаціліся аблавы на моладзь. Па спісах, складзеных старастам-паліцаем, у адну са снежаньскіх раніц з хат павыганялі хлопцаў і дзяўчат, пагналі ў райцэнтр, у Клімавічы.

Трапіла ў тыя спісы і мая будучая мама — 19-гадовая Клаўдзія Курачова. Медыцынская камісія адбірала самых здаровых і прыгожых. Для гэтага ўсіх распраналі дагала (дзяўчаты нават страчвалі прытомнасць ад сораму) і ганялі па дактарах — з кабінета ў кабінет. Напрыканцы выносіўся вердыкт: годны ці не.

У першы раз маю маму выратавала нямецкая педантычнасць. У назве вёскі было напісана «Родня» замест «Рудня», з-за чаго і прагучала выратавальнае «Вэк»... Мама казала, што, пачуўшы яго, усе 12 кіламетраў да дома бегла і плакала, паўтараючы два словы: «Хрыстос Уваскрос!». Так вучыла яе бабуля, так матуля вучыла потым нас. Іншых малітваў мы не ведалі.

А ўжо ў пачатку лютага 1943-га паліцаі зачыталі новыя спісы, прызначылі новы дзень і месца збору моладзі. Пры гэтым пагрозліва абвясцілі, што, калі нехта не з'явіцца, расстраляюць родных.

Мамін бацька, а мой, значыць, дзед Сямён, тады паехаў у горад шукаць нейкага паратунку. І добрыя людзі падказалі яму, што сярод нямецкіх дактароў ёсць і наша, савецкая: яна можа даць патрэбную даведку аб стане здароўя.

Позна ўвечары дзед знайшоў дом, дзе доктар Вараб'ёва з пяцігадовай дачушкай здымала пакой (муж-афіцэр быў на фронце, а яе, можа, прымусілі працаваць? Ды і жыць жа за нешта ж трэба было)...

Дзядуля са слязамі на вачах выказаў жанчыне сваё гора, прапанаваў і плату — бохан хлеба і кавалак сала. Жанчына абяцала дапамагчы. І, дзякаваць богу, слова сваё стрымала: калі ў другі раз моладзь прывезлі ў бальніцу, мама знайшла вачыма патрэбную жанчыну (маладую, з прыгожымі чорнымі валасамі), падышла да яе, назвала сваё прозвішча... Доктар тады і выпісала вось гэтую самую даведку. А мама, пачуўшы гартаннае нямецкае «кранк» (хвора) ды балючы штуршок у спіну, зноў апынулася на вуліцы. Зноўку бегла, плакала і дзякавала Богу.

Здраднік-паліцай тады аж счарнеў ад злосці. Ён добра ведаў, што дзяўчына здаровая. Прыйшоў у хату і сказаў дзеду, што ў наступны раз павязе маму сам — болей не адкруціцца.

Моладзь, каб неяк уратавацца ад вывазу, спрабавала рознае: газай націралі рукі, самі сабе наносілі раны ды пасыпалі соллю, нешта капалі ў вочы і вушы... Вёска застыла ў цяжкім чаканні. І вось 29 жніўня. Моладзь пад дуламі паліцэйскіх аўтаматаў зноў павялі ў Клімавічы. Але на шчасце гэту працэсію ў лесе ўжо чакала партызанская засада. Паліцаяў і старасту расстралялі. Хлопцы і дзяўчаты вярнуліся дамоў у вёску, на якую праз месяц абрынулася новая бяда: «набожныя» фашысты на Узвіжанне сталі гойсаць ад хаты да хаты, паліваць сцены газай і падпальваць...

Дзед Паўлюк, убачыўшы, што злыдні трохі адбегліся, стаў заліваць вадою агонь... Праўда, нічога добрага з гэтага не выйшла. Немцы, якія пільна за ўсім сачылі, вярнуліся назад, схапілі дзеда за каўнер і кінулі... у дзверы палаючай хаты.

Вёскі не стала гадзіны за дзве. А дзед Паўлюк — выжыў. Толькі з таго дня стаў часта траціць прытомнасць і праз тры гады заўчасна памёр.

Тым часам савецкія войскі хутка набліжаліся да беларускай мяжы. У канцы верасня 1943 года былі вызвалены чыгуначная станцыя і горад Клімавічы.

Назаўтра ж пасля вызвалення дзед Сямён кінуўся туды, каб яшчэ раз падзякаваць доктару Вараб'ёвай, але не заспеў яе. Бабуля, у якой яна здымала пакой, апусціўшы вочы, сказала, што ні пра кватарантку, ні пра яе дзіця нічога не ведае. Жанчына быццам знікла. Магчыма, яе проста арыштавалі за «супрацоўніцтва з немцамі»? Такое ж тады вельмі часта здаралася... А мы вось жывём і помнім яе.

Нізкі паклон вам, доктар Вараб'ёва!

**Наталля Сівак,**
*в. Заполле, Чэрвеньскі раён.*

Так ці не?

# КОСЦЬ БЫВАЕ БЕЛАЯ... А КОСТКА — НЕСВЯНЦОНАЯ

**«Часта чую выраз «вскрытие покажет», і ў рускай мове ён мяне зусім не бянтэжыць, — піша спадарыня Марыя Хмара, — а вось у беларускай... Ці правільна казаць, што «пакажа ўскрыццё»? І яшчэ дзве просьбы з таго ж канверта: растлумачыць, чым адрозніваецца «косць» ад «косткі» і што азначае бабуліна «дзень ада дня»?**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.**

1. Тое, што па-руску называецца *вскрытие* (у медыцынскім сэнсе), у беларускай літаратурнай мове і мела, і мае назву **анатамаванне** (ад дзеяслова **анатамаваць**). Менавіта гэтыя словы мы і раілі б да выкарыстання. Што да згаданага чытачкай *ускрыцця*, то яно з'явілася пад уплывам рускай мовы і, на жаль, нават «прапісалася» ў некаторых слоўніках.

2. Словы **косць** і **костка** маюць у нашай мове роўныя правы. Але трэба ведаць і пра адрозненні. У анатоміі прыняты тэрмін **косць**. Таму, пішучы альбо разважаючы на медыцынскую тэматыку, трэба выкарыстоўваць гэтае слова. Адрознае ад яго **костка** выкарыстоўваецца ў выпадках, якія не патрабуюць трымацца тэрміналогіі альбо калі гаворка ідзе не пра чалавечыя косці. Прыгадаем, напрыклад, Купалаву «Паўлінку»: *Дык чаго ж ты, тудэма-сюдэма, несвянцоная костка, рассеўся, як у сваёй хаце!*

Тут варта яшчэ звярнуць увагу на ўстойлівыя выразы. Напрыклад, *слановая косць* (а не *костка*), *скура ды косці* (а не *косткі*), але: *як костка ў горле* (а не *косць*).

3. Слова **дзень** у нашай мове ўжываецца ў шматлікіх выразах. Многія з іх падобныя да рускіх адпаведнікаў: *дзень за днём* і *дзень ада дня* (з кожным днём, паступова), *з дня на дзень* ('у самы бліжэйшы час') і г. д. Але ёсць і цікавыя выпадкі, калі ў дзвюх мовах могуць выкарыстоўвацца адрозныя варыянты:

в один день (зрабіць нешта) — **за адзін дзень, аб дзень;**

в один прекрасный день — **аднаго разу, аднаго дня, аднойчы;**

день-деньской — **цалюткі (цэлы) дзень, з раніцы да вечара;**

изо дня в день — **дзень пры дні, дзень у дзень;**

на днях — **гэтымі днямі** (калі гаворка пра мінулае, ужываецца слова **надоечы**).

## У абарону слоў

У Навагоддзе ў сувязі са шматлікімі святамі не раз гаварылася і пісалася пра адпраўленне і ўручэнне паштовак. Тэма як быццам добра вядомая, і ўсе словы, якія мы выкарыстоўваем, здавалася б, прывычныя. Але адно з іх апошнімі гадамі ўсё ж крыўдзяць: **канверт**, які доўгія дзесяцігоддзі служыў нам верай і праўдай, сёння часцяком замяняюць варыянтам *капэрта*, хоць рабіць гэта наўрад ці варта, бо *канверт* (у тагачасным напісанні *канвэрт*) фіксаваўся яшчэ ў дарэформенных (да 1933 года) слоўніках. Ёсць гэта слова і ў творах класікаў нашай літаратуры. Таму карыстаймася ім без сумненняў!

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Рэзананс

# СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Асалода чытаць па-беларуску (у тым ліку — «Звязду»), асалода пісаць. На гэты раз узяцца за пяро прымусілі дзве публікацыі. Першая — Алены Ляўковіч пра паштоўкі як люстэрка часу. Іх некалі і сапраўды прысылала радня, падпісвалі вучні (я працавала настаўніцай), і таму цяпер проста рука не падымаецца нешта выкінуць. Часам перабіраю, разглядаю і наплываюць такія ўспаміны...**

А другая — «нефармат» Святланы Яскевіч «Найвялікшае шчасце». Гэта і наогул як быццам пра мяне, бо я таксама ляжала ў траўматалогіі, таксама выпісалася адтуль за два дні да Новага года. Да таго ж разам са мной ляжала жанчына з пераломам пазваночніка: яна палезла павесіць цюль ды і навярнулася, як той казаў... Да яе штодня прыходзілі то сын, то нявестка, даглядалі, мылі. Розніца толькі ў тым, што ўсё адбывалася ў нас, у Гродне.

Сустаў, які мне замянілі там, служыць верай і праўдай, за што хочацца шчыра падзякаваць хірургу Міхаілу Рыгоравічу Малкіну. А далечваў мяне другі ўрач — Іван Міхайлавіч Ганчарук... Грэх не ўспомніць і сваіх, смаргонскіх медыкаў, асабліва — Наталлю Вячаславаўну Курбацкую. Каторы гадок я ў яе на ўліку...

Ды і наогул, пакуль не скруціла хвароба, я не ведала, што навокал так многа добрых людзей. Ні разу не было такога, каб хто-небудзь не кінуўся мне дапамагчы: і падвезці прапануюць, і падвезці.

...А перад Новым годам і наогул свята было! На яго мяне запрасілі мае апошнія выпускі. Адна дзяўчынка (яны для мяне пажыццёва дзяўчаткі) прыехала з Калінінграда, і сабраліся разам Алеся Невяровіч, Каця Ерамеева, Таня Вяль, Марына Бурачэўская, Вольга Ількевіч, Наташа Майсевіч... Мяне таксама ў кафэ прывезлі (нашай школы даўно няма), падарылі такі букет, напісалі такія пажаданні...

Вось і думаю: а хай бы нейкі год у нас стаў Годам дабрыні ці добрых спраў!

**Г. У. Пятроўская,**
*г. Смаргонь.*

Смех смехам

# НАРАДЖЭННЕ ПАЭТКІ

**...Калі на свет з'явілася наша дачушка Ганначка, мы з жонкай завялі спецыяльны сшытак, куды сталі запісваць «этапы росту» — першыя дасягненні дзяўчынкі, смешныя выпадкі, незвычайныя словы — усё, што «генеруе» яе нястомная фантазія. Апошнім часам, напрыклад, наша дачка палюбіла рыфмы. Выдала неяк:**

*«Я прачнулася зарана*
*І глядзела на барана».*

Напэўна, убачыла на палічцы кніжку казак з яго выявай, а можа... мяне, бо па гараскопе я — якраз ён.

Ёсць, карацей, над чым падумаць.

Занатоўвалі за малой і нешта бессэнсоўнае — на першы погляд:

*«Мы прыйшлі і паглядзелі:*
*Усе арэлі захварэлі».*

Можа, скрыгат падаўся праявай хваробы?.. А яе «бабуля-Натуля — цёплаю кашуляй»? А «тата Жэня — вялізазным пельменем»?

Вось гэта, на жаль, таксама пра мяне. Нават крыўдна стала! А з іншага боку, за што крыўдаваць?.. Трэба зноў пачаць бегаць ці менш налягаць на яечню, асабліва нанач, каб не быць тым «пельменем»!

…«Спатыкнулася» дзіця хіба на дзядулю Ігара, які ну ні з чым не рыфмаваўся! Аж заплакала, беднае, але ж нашых падказак не прыняло. І што важна, не адступілася: праз некалькі гадзін, калі мы ўжо і забыліся на гэтую гульню, раптам закрычала: «Тыгр! Тыгр!» «Які, — пытаем, — тыгр і адкуль?» А малая нам: «Дзеда Ігар — ён жа тыгр! Я сама прыдумала!»

«Паэтка расце!» — не без гонару адзначылі мы з жонкай і пакаціліся са смеху.

**Яўген Мартыновіч,**
*г. Мінск.*